№ 11 (153). Rok XI. „SZLACH MOŁADZI“ Wilno, 15.VI.1939.

ШЛЯХ МОЛАДЗІ
ŠLACH MOŁADZI

ІЛЮСТРАВАНЫ ЧАСАПІС БЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗІ

№ 11 (153). Вільня, 15 Чэрвеня 1939 г. Год XI.

Чаму гаспадарчае палажэньне ў нас цяжкое

Што цяжка ў нас жывецца, аб гэтым не патрабуем многа гаварыць, бо ўсюды чуем нараканьні й гэта справа агульнаведамая. Але чаму іменна цяжкое гаспадарчае палажэньне ў нас, над гэтым мы не заўсёды затрымліваліся, тым больш, што «прыяцелі» нашы прычыну гэтага заўсёды знаходзілі ў беднасьці нашага краю. Аднак байка аб беднасьці перастае быць актуальнай. Нават б. польскі прэм'ер і маршалак Сэнату А. Прыстар у сваей прамове („Słowo“ 11.VI.39) гаворачы, што Усходнія Землі Рэчыпаспалітай пад узглядам матарыяльным не дацягваюць да сярэдняе меры, зазначае, што край гэты мае аграмадныя лясы з рэдкай на сьвеце зьвярынай, рыбныя вазёры й разьліўныя рэкі, ураджайную глебу, расьлінныя сырцы й скрытыя ў зямлі багацтвы натуральныя, прыцягваючыя краявіды, каторыя зьяўляюцца разрыўкай нават для загранічнікаў. Словы п. А. Прыстара пацьвярджаюць фактычна ўсё тое, што мы пісалі ў апошніх нумарох «Шляху Мол.» аб багацьцях нашага краю й яго самавыстарчальнасьці.

Дзе-ж тады прычыны зла?— О, іх ня лёгка пабачыць! Усё фактычна скрыта. І калі сяньня мы кажам, што землі нашыя самавыстарчальныя, дык можа знайсьціся такі спрыцяк, каторы скажа, што гэта «няпраўда», а як «доказ» можа паказваць цыфры, што г. зв. Усходнія Землі менш плацяць падаткаў скарбовым урадам, чымся цэнтральныя, ды што ўрад на ўтрыманьне адміністрацыі й іншых дзяржаўных органаў, у каторых, трэба ведаць, часта бывае многа бюрократыі, выдае вялікія сумы. Ясна, такая гутарка — гэта чысьцейшая дэмагогія, бо падаткі плацяцца ня толькі безпасярэднія, але й пасярэднія, — гэтыя купляючы соль, цукар, нафту, гарэлку, серчыкі й інш. зманапалізаваныя тавары, або ад каторых падатак бярэцца ў фабрыках, капальнях, і аб чым ня кожны нават грамадзянін ведае; колькасьць такога пасярэдняга падатку з нашага краю вельмі цяжка аблічыць. Такім чынам, усе гэныя пасярэднія падаткі мы плацім, сьледу іх на вонкі ня бачым, а зарабляюць на іх землі цэнтральнае й заходняе Рэчыпаспалітае і іх — гэтыя землі — хваляць, а землі ўсходнія ганяць. Ды ня толькі купляючы соль, газу й іншыя пералічаныя вышэй тавары плацім падаткі й узбагачваем цэнтральныя й заходнія землі Рэчыпаспалітай. Робім гэта купляючы розную крамніну, а так-жа й тады, калі бяруць ад нас сырцы, вязуць іх у цэнтр Рэчыпаспалітай, ператвараюць іх там і пасьля дастаўляюць нам гатовым таварам. Тады яшчэ даходзіць на нашу некарысьць і тое, што работнікі, фабрыкі з цэнтру дзяржавы маюць больш работы, а ў нас разьвіваецца большае безрабоцьце і ўстрымліваецца разьвіцьцё промыслу. Так напрыклад: вывозіцца ад нас у цэнтр Рэчыпаспалітай жыта, а прывозіцца мука, крупы, вотрубы; вывозіцца ячмень, бульбу, а прывозіцца піва, сьпірт; вывозяць фрукты, ягады, а прывозяць насеньне, кветкі, садзонкі; вывозяць, хоць у невялікай колькасьці, цукровыя буракі, а прывозіцца цукар; вывозяць рыбу, а дастаўляюць кансэрвы; вывозяць дрэва, анучы, а прывозяць паперу, цэлюлёзу і г. д. Пераробка гэных сырцоў магла-б адбывацца на месцы. Мог-бы больш разьвівацца промысел тэкстыльны, напр. Беластоцкі, каторы заспакоіў-бы патрэбы нашага краю. Карыстаў-бы з гэтага мясцовы селянін, работнік, разьвіўся-б мясцовы промысел, гандаль, і край паступова багацеў-бы, палажэньне папраўлялася-б.

Для папраўы эканамічнага палажэньня, асабліва палажэньня вёскі, патрэбна яшчэ бязумоўна шырокая зямельная рэформа, а так-жа агульная й фахова-земляробская асьвета, дзеля разьвіцьця якое надта мала што робіцца. Трэба так-жа большае прапаганды нашых тавараў і вывазу іх заграніцу. Урэшце, — трэба, каб былі выкарыстываныя натуральныя багацьці нашага краю, нашае зямлі. У першую чаргу напр. трэба, каб пашыралася ў нас электрыфікацыя, для якое ёсьць вялікія дагоднасьці й якая спыніла-б запатрабаваньне нафты, а так-жа выкарыстываньне торфу, жалезнае руды, што ўзноў устрымала-б прывоз вуглю й жалеза.

Каб усе аднак гэтыя добрыя нашыя жаданьні спаўняліся, каб палажэньне эканамічнае нашага краю папраўлялася, патрэбная, як бачым, прад усім рашучая зьмена да гэтага краю гаспадарчае дзяржаўнае палітыкі, а так-жа, каб жыцьцём кіравалі ў нас мясцовыя людзі, поўныя любові да свайго краю й да нашага народу. Бо толькі той чалавек будзе належна працаваць і паляпшаць быт нашага краю, каторы з ім зроднены, каторы яго любіць, като-

Украінскі часапіс аб Беларусах і М. Машары

Украінскі львоўскі часапіс „Новий Час“ у літаратурна-навуковым дадатку дн. 12.VI.39 году зьмясьціў артыкул Яро Домазара п. н. „Міхась Машара.“ У артыкуле гэтым між іншым чытаем: „Беларускі Народ тое, што іншыя народы здабывалі сярод спрыяючых абставінаў, паступова, з пакаленьня ў пакаленьне, мусіць здабываць, надрабляць у гарачкавым тэмпе. І ў кожнай галіне: палітычнага, грамадзкага, эканамічнага й літаратурнамастацкага жыцьця відаць у Беларусаў вялікія поступы, што сьведчаць аб бязьмежным гоне да жыцьця паводле сваіх упадобаў. Найлепшым доказам гэтага ёсьць маладая беларуская літаратура.“ — Далей аўтар артыкулу разглядае й вельмі высока ацаняе творчасьць нашага паэта Міхася Машары.

Сапраўды беларускі адраджэнскі рух, ня гледзячы на цяжкія абставіны, ідзе наперад і ніхто яго ня стрымае. Беларускі Народ мусіць адрадзіцца й здабыць сабе лепшую будучыню.

ры будзе глядзець на Беларуса, на беларускага селяніна, не папанску,як на нешта ніжэйшае, цёмнае, што можна толькі выкарыстываць, але як на людзей, як на народ, каторы хоча жыць сваім жыцьцём культурна й на гэта мае ўсе правы. Я. Н.

* * *

Там над Дзісенкай і Нёманам сінім
бельлю палошчуцца ў сонцы сады.
Гэта ня сон,... ня зіма,... і ня іній, —
гэта вясьняны уздым малады.

Гэй, песьняры, што замоўклі сягоньня?
Дзе цымбаліст, скрыпачы і дудар?
Час мо' на песьні настаў нявыгодны,
Нейкія сумы ляглі на наш твар.

Ходзіць вясна чараўніцай па полі,
зёрнамі выйшаў араты званіць,
сумы — сумлівы і гора і болі
будзем з трывогай у песьнях тапіць.

М. Машара

Струна

Чаго ты плачыш пад рукою?
Струна! Скажы мне!—не таі...
Ці разстанёмся мы з табою?
Ці мала будзем у дваіх?

Ды я-ж крануў цябе, як даўна,
Той самы лад я націскаў...
Той сьпеў тварыў музыка слаўны..
Той сьпеў душу маю ласкаў.

Чаму, струна, дрыжыш плачліва?
Ці прачуваеш што? — Скажы!
Ці мо' і я так сіратліва
Калісь дзе-небудзь буду жыць?

Ты боль, боль струн, сьцішысь, ня рвіся,
Ня рань мне сэрца, не калі!..
Я ўжо зрабіў із думак высеў
Па роднай, бацькаўскай зямлі.

Чаму-ж, струна, дрыжыш плачліва?
Дзе звон пявучых галасоў?
Ня плач! усходзе наша ніва,
Дасьць плод сваіх нам каласоў!..

Новік Ганна

Anita

Pavarot

„Šumiać kalosy, noč i zory,
Kudy žalezny koń śpiašyć?...
Mo' chutka rodnyja razory
Ubaču ja vačyma šyb.“
M. Tank

Zmučany doŭhaj padarožaj i niedaspanymi načami Aleś ucisnuŭsia ŭ kutok vahonu j pryžmuryŭšy vočy staraŭsia praspać apošniuju noč svajej padarožy. Ale ŭ hałavie niespakojna błutalisia dumki ab zaŭtrašnim dni, katory čakaŭ jaho na rodnaj ziamli, u rodnaj vioscy. Snavalisia jašče prad vačyma j uspaminy apošnich dzion u čužym, dalokim krai. Vočy Alesia poŭnyja byli jašče ciemry kapalni, u katoraj jon pracavaŭ apošnim časam. Čuŭ jon jašče j hłuchi stuk i zvon udaraŭ mołata. Daloka astaŭsia za im hety jaho „prastor śvietu,“ za jakim tak tužyŭ prad piaćmi hadami,i kudy vyhnała jaho niespakojnaja duša šukajučaja niečaha novaha, niaviedamaha. Tady šmat maładych chłapcoŭ pajšło za chlebam u čužy kraj i jon z imi, choć jaho niva čakała silnych ruk. Pakinuŭ jon rodnuju nivu, staroha baćku j małodšaha brata. Jak-ža jon — Aleś — ciapier budzie jeści hety chleb, ichnim potam i horam zdabyty?. .

Piać hadoŭ tamu nazad!.. Viesnavoju miesiačnaju nočkaj usie spali ćviordym snom zmučanych ludziej... Jon-ža, Aleś, stojačy pry vaknie, łaviŭ šalonuju dumku, katoraja blisnuła jamu niehdzie z milhajučaha śviatła z stancyi, skul za 3 hadziny mieŭ adyjści ciahnik... Schiliŭsia, padkraŭšysia, nad hłybokaj skryniaj i poŭnym rucham znajšoŭ miašočak z hrašmi, praznačanymi na kuplu kania j płuha.

Dryžačymi rukami ścisnuŭ miašočak i cicha, chutka ukinuŭšy patrebnyja ŭ čamad an rečy, ahlanuŭsia na śpiačych ćviordym snom... i vybieh z chaty.

U cišyni nočy pačuŭsia vostry, silny śvist ciahnika...Aleś bieh praz pole, łuhi, kusty, a za im hnalisia słovy staroha baćki.

— Ty j nia dumaj, synok, pakidać nas i ziamlu, z katoraj treba silnymi rukami vydzierci chleb... Najom čužych ruk ni zastupić ciabie, haspadara. Zołata nie nakapaješ u mieście, ni ŭzbahaciš siabie ani nas, bo nam usim najdaražejšym zołatam jość rodnaja pole, niva, zbožža, sonca...

Kožnaje słova baćki hnałasia za im, ale nie zmahło jaho zatrymać. I nie zmahło zatrymać jaho śviatło bliskučaje z chaty lubaje dziaŭčyny, jakaja jašče peŭnie tkała tonki šery kužal...

Paśpieŭ jašče kupić bilet i uskočyć u vahon. Na raźvitańnie-ž u dušy sabie skazaŭ:— „Ja chutka viarnusia... vybačajcie...“

Pavarot adnak na rodnuju ziam

Biełaruskaja Pilihrymka ŭ Kalvaryju

Za prykładam minułych hadoŭ, u pieršuju niadzielu m ca červienia (4.VI) adbyłasia sioleta z Vilni tradycyjnaja Biełaruskaja Pilihrymka ŭ Kalvaryju. Brali ŭ joj udzieł nia tolki vilenskija Biełarusy, ale tak-ža j z inšych kutkoŭ našaha Kraju. I tak byli biełaruskija pilihrymy z pavietaŭ: Vialejskaha, Vilenska-Trockaha, Šviancianskaha, Ašmianskaha, Vałožynskaha, Brasłaŭskaha, Lidzkaha, Vaŭkavyskaha, a navat i Biełastockaha. Mnohija prybyli piechatoju, mnoha maładych chłopcaŭ pryjechała na rovarach, a miascovyja biełaruskija dziejačy z-pad Žodzišak (Vialejski pav.) sarhanizavali cełuju hrupu—100 asob, — katoraja pryjechała ciahnikom, atrymaŭšy na čyhuncy 50 pracentnuju źnižku ŭ płacie za prajezd.

Pilihrymka vyjšła z Vilni paśla nabažeństva ŭ Kaściele św. Mikałaja, jakoje adpraviŭ ks. V. Šutovič i ŭ časie jakoha ŭsie prysutnyja śpiavali bieł. relihijnyja pieśni. Kazańnie ŭ kaściele skazaŭ vielmi pryhoža ks. dr. St. Hlakoŭski. Vialiki pachod Bieł. Pilihrymki praz miesta Vilniu byŭ vielmi strojny j dobra sarhanizavany. Načale za kryžam išli bieł. ksiandzy: St. Hlakoŭski i V. Šutovič, za imi bieł. dzietki, paśla bieł. skaŭtki i skaŭty, katoryja byli praŭdzivaj azdobaj pilihrymki, i ŭreščie bieł. intelihienty, rabotniki j sialanie. Nia hledziačy na toje, što byli heta ludzi z roznych staron, išli družna, uparadku, čaćviorkami, pakazvajučy hetym svaju hramadzkuju j kulturnuju vyrablenaść. Nad usimža pachodam razlahałasia mahutna melodyja bieł. relihijnych pieśniaŭ.

U Kalvaryi da pilihrymki dałučyŭsia ks. V. Hadleŭski, katory razam z ks. ks. St. Hlakoŭskim i V. Šutovičam na źmienu havaryli bieł. kazańni abvodziačy pilihrymaŭ pa darozie mukaŭ Chrystovych i padčyrkivajučy, što robiać heta ŭ česć 950-tych uhodkaŭ Chryścijanstva ŭ Biełarusi. U časie abchodu stacyjaŭ šyroka razlahalisia tak-ža bieł. pieśni-molby ŭ česć Chrysta, vyjaŭlajučy žadańnie Biełaruskaha Narodu malicca ŭ rodnaj biełaruskaj movie j słuchać Božaha Słova nia tolki ŭ Bieł. Pilihrymcy, ale i ŭva ŭsich śviatyniach našaha Kraju.

Mocna miašaŭ Pilihrymcy biezpraryŭny doždž i choład, adnak jana stojka jšła, u praciahu 4 hadzin, až da kanca, da kaścioła na Kalvaryjskaj hary pa Bahasłavienstva, nia minajučy nivodnaje stacyi, čaho nie rabili inšyja pilihrymki. Daždžlivaje, chałodnaje nadvorje nadavała Bieł. Pilihrymcy niejkaje symbaličnaje značeńnia, što zusim pravilna padčyrknuŭ adzin z kaznadziejaŭ, havoračy kazańni ab mučeńniach Chrysta j žyćci Biełaruskaha Narodu.

Atrymaŭšy bahasłavienstva ŭ kalvaryjskim kaściele, zakončyli Biełarusy svaju Pilihrymku bieł. relihijnym himnam „Boža, što kaliś narody...“ i razyjšlisia jznoŭ kožny da svaje pracy z mocnaj vieraj na lepšuju budučyniu!...

jn

Плачуць лозы

Плачуць лозы над вадою:
„Эх, жыцьцё, жыцьцё. —
Не разстанешся з бядою,
Не палепшыцца быцьцё!“

Вецер злосна шаматнуўся,
Выдраў з сэрца жаль,
Над вадою скалыхнуўся
Й недзе зьнік—прапаў між хваль.

Воды льюцца ды булькочуць
І плывуць сабе, плывуць,
Знаць і ведаць, ох, ня хочуць,
З чым яны у даль бягуць.

Плачуць лозы над вадою,
Сьлёзы льюцца ў даль...
А ў жыцьці цякуць струёю:
Гора—мукі, беды й жаль.

Ул. Гарт.

Парупцеся прыслаць заказ (5 зл.) на зборнік твораў беларускай паваеннай паэзіі (Антолёгію). Справа гэта пільная! Калі ня маеце ўсіх грашэй самі, то зьбярэце іх спосабам складчыны.

Заказы прысылайце на адрас рэдакцыі „Ш. М.“ і „Калосься“.

---

lu,—što hod dalej,—zdavaŭsia jamu mieniej patrebnym, dalokim i ŭ baraćbie za štodzienny chleb zabyvaŭsia pra svoj kraj i siamju.

Usio niečaha šukaŭ, ale ŭsio jamu niečaha nie chapała. Až raz pryjšła takaja chvilina, kali zrazumieŭ siabie i kali pačuŭ, skul kličа jaho dola: — adžyła ŭ jahonym sercy tuha pa rodnym krai.

Doŭha błudziŭ pa ciesnych labiryntach kapalnianych z vačyma poŭnymi čornaha miełkaha pyłu. I kali vyjšaŭ na volny prastor, užo sił jamu ni stała nazad viarnucca.

Raz z pošty prynios Symon i kinuŭ jamu ŭ vočy biełymi kartami knižak i časapisaŭ, jakija pra havaryli jaho rodnym słovam:

„Śpiš niespakojna ty vioska maja,
sny kałasista uzornyja tkucca,
tam dzie spatkałasia z niebam ziamla,
tam — dzie biarozy biełyja hnucca.“

Viesnavaja pieśnia ziamli rodnaj zamuciła spakoj ciesnaha zadymlenaha pakoju rabotnikaŭ.

„Budziem čornymi rukami snuć spakoj,
u zaru hadoŭ pyłajučych ŭhladacca.
Pojdziem praz chmary sinija z padniataj hałavoj
i skryšym ich ŭ mazolnych palcach!“—

Vincuś pierastaŭ na chvilinu čytać i zakuryŭ papiarosu. U sinim vobłaku dymu bliščeli jaho ciomnyja vočy, razharełyja vialikaj dumkaj.

— Kali my tudy vierniemsia?— pytaŭ Symon źviartajučysia da Vincusia.

— Čas užo, my tam patrebnyja ziamli, ale kab jašče hadok vytrymać, było-b dobra.

Alesia ab pavarot nia pytajuć. Bo ci-ž nia viedajuć, što ŭpadabała jaho pryhožaja dačka staršaha rabotnika, Pałaka. Ci-ž nia viedajuć, što čuć nia kožny viečar Aleś słuchaje viasiołaha śmiechu hetaj dziaŭčyny j z baćkam jejnym abhavaryvaje intaresy ŭ dastatnym pamieškańni, pry bahatym stale, pry šklancy piva. Adnaho adnak nia viedali chłopcy, što jon, Aleś, nia maje ŭžo sił viarnucca da taho čornaha śvietu, bo zatužyŭ pa rodnym prastory i błakicie. Nia viedali chłopcy, što adžyła ŭ im luboŭ rodnaj ziamli, jakaja klikała Alesia ŭ rodnuju viosku. I voś astaŭsia jašče Vincuś i Symon, a jon viartajecca.

Žviniać, śpiavajuć koły ciahnika melodyjnym hołasam Vincusia:

„čas ŭžo ziamlu apajasać zaroj,
razsiejać husta zory pa staroncy,
kab zaźvinieli našy nivy čornaju ralloj,
pad załatym naroham sonca.“

* * *


Ciopłym vietrykam zbudžany ustavaŭ viesnavy sonięčny dzień. Praz hołyja jašče haliny drevaŭ snavaŭsia laniva dym z kominaŭ vioski j razchodziŭsia pach hatavanaje bulby. Vočy ludziej zahaŭ relisia radaściaj, hledziačy na łohka zielaniejučyja łuhi j čornyja, vilhotnyja razory paloŭ. Adhetul pierapłyvaŭ u viosku pach syroj

Źjezdy moładzi j narady kulturnych arhanizacyjaŭ u Ukraincaŭ i Litoŭcaŭ

— 4.VI. sioleta ŭ Lvovie adbyłosia vialikaje ŭračystaje śviata ukrainskaje moładzi, uzhadavanaje T-vam „Ridna škoła."—8.VI. u Lvovie adbyŭsia ahulny hadavy schod ukrainskaha kulturnaha T-va „Prośvita." Na staršyniu hetaha T-va vybrany a. kanonik Juljan Dzeravič, bliski supracoŭnik Mitrapalita A. Šeptyckaha, jaki sioleta 18 h.m. śviatkuje 40-hodździe svajho jepiskapstva.

— Nadoviačy ŭ Vilni adbyŭsia ahulny hadavy źjezd litoŭskaha T-va „Kultura." — 11.VI. sioleta ŭ Vilni byŭ sarhanizavany vialiki źjezd litoŭskaje moładzi. Pry hetym adbyłasia supolnaja pilihrymka moładzi ŭ Kalvaryju, a paśla viečar u Lit. Himnazii im. Vitaŭta Vialikaha. Na viečary byŭ miž inšym litoŭski biskup Reinys, katory pryjechaŭ z Vilkavišak u Vilniu na karotkija adviedziny.

— Biełaruskaja ž moładź nia moža sarhanizavać svajho źjezdu j śviata, bo dasiul, na žal, nia maje svaje arhanizacyi. Usie-ž sproby ŭ hetym kirunku załomlivalisia dasiul, z pryčyny admovy administracyjnych uładaŭ zaćvierdzić statut arhanizacyi biel. moładzi, abo navat zabarony adbyć arhanizacyjnyja schody.



Słaŭny francuski vučony L. Pasteur, katory adkryŭ leki suproć zarazy šałonaści

* * *

Так нядаўна грымелі гарматы
Сярод родных, спакойных палёў.
Яшчэ мучыцца й сяньня араты
Там, дзе сьмерць піла чарамі кроў.

На крывавы банкет прылятaлі
Ў поўным розквіце сілы—арлы,
Шмат з іх крыльля сваё паламалі
У пякельна-гарачым баі.

Пры дарозе, гдзе могілкі брацкія
(Пачарнелі ад часу крыжы),
Там магутныя сілы юнацкія
Залеглі ад мяжы да мяжы.

І ня сьніцца ім пэўне трывога,
Што лунае над соннай зямлёй,—
Сяньня-ж госьці крывавага бога
На дабычу спадзеюцца зноў.

М. Базылюк

ziamli j astavaŭsia na parohach chat. Tady adčynilisia šyroka dźviery j vočy jašče sonnyja ŭśmiachalisia da jasnaha błakitu.

Michaś vyvieŭ kania, zaproh u płuh i nakiravaŭsia ŭ pole. Čornyja skiby adna za druhoj roŭna kłalisia za im i bliščeli ŭ załatych pramieńniach uzyjšoŭšaha sonca. Žaŭranak piajaŭ jamu nad hałavoj i Michasiu chaciełasia śpiavać niejkuju radasnuju pieśniu, katoraje słovy padali jamu ŭ serca, jak čornyja, śvieżyja skiby ziamli. Nia viedaŭ Michaś, što jahonaje serca śpiavaje pieśniu ziamli, jaje radasny viesnavy hymn. Bo serca Michasia było tak mocna źviazana z sercam ziamli, što kožnaja radaść, sum, tuha j rabota byli supolnymi. Kachalisia tak mocna ŭsie na śmierć i žyćcio j razam płakali j śmiajalisia...

Dumaŭ Michaś i śpiavaŭ. I śpiavała ziamla.

Sonca vyšej padyjšło j macniej pryhreła. Michaś skinuŭ siarmiažku j blisnuŭ na čornym poli biełaj kašulaj. Staŭ na chvilinu abapioršysia ab płuh i abniaŭ vačyma azałočany soncam śviet.

Darohaj, što ciahnułasia ad stancyi, pevnie z ciahnika, niechta jšoŭ pavoli, razhladajučysia, z čamadanam u ruce. Chto-ž heta moža być, hety małady mužčyna, u miestavaj vopratcy,— z zacikaŭleńniem dumaŭ Michaś i chutka źviarnuŭ kania na ściežku kala kustoŭ alešnika, kudy ciapier nakiravaŭsia padarožny. Michaś schiliŭsia, byccam papraŭlajučy štoś kala płuha.

— Pamahaj tabie Boh, —adazvaŭsia da jaho viasioły, ale cichi hołas.

— Aleś!—uzradavaŭšysia kryknuŭ Michaś i vyciahnuŭ ruki da brata.—Prypomniŭ adnak ty svoj kraj i siamju, my ŭžo dumali, što ty da nas nikoli nia vierniešsia, čuli my, što ty tam ažaniŭsia,—mo' heta praŭda?

— Dziakavać Bohu, jašče nie, i ci mnie było tam dobra ci drenna, — nikoli tam ni viarnusia, kali pryjmiecie mianie.

— Viarnuŭsia ty, dyk i dobra, maješ prava... Pevnie pierakanaŭsia, što ciažkaje žyćcio miž čužymi j na čužoj ziamli...

Zamoŭkli na chvilinu, a koń pačaŭ niespakojna krucicca z płuham.

— Viedaješ Aleś, hety koń kuplany za tvaje hrošy, i płuh i małatarka taksama...

— Michaś, a jak matka j baćka,—ci jašče hnievajucca na mianie?

— Ci-ž nia znaješ serca baćkoŭ?—Vialikaja radaść ich siańnia čakaje... Budziem razam užo pracavać, šmat raboty nas čakaje. Nu, dyk idziom da chaty ŭžo, para na śniadańnie.

Pajšli. Michaś z kaniom i płuham, što srebram bliščeŭ u soncy, a Aleś u ciomnaj miestavaj vopratcy, z čamadam u ruce.

(*dalej budzie*).